**Ларкоў** Пётр Пятровіч // Памяць. Расонскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. М. Хількевіч. — Мн. : БелЭН імя П. Броўкі, 1994. — С. 546 — 547.

## ЛАРКОЎ ПЁТР ПЯТРОВІЧ

Нарадзіўся 4.6.1963 г. ў в. Алёшча Полацкага р-на Віцебскай вобл. Беларус. У 1978 г. Пётр скончыў Маласітнянскую васьмігадовую школу, потым Палотаўскую сярэднюю школу, у Віцебскім ПТВ № 37 атрымаў прафесію токара, працаваў на заводзе заточных станкоў. У кастрычніку 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію Віцебскім гарваенкаматам. Пасля заканчэння дэсантнай школы быў накіраваны ў Афганістан. Малодшы сяржант П. П. Ларкоў загінуў 3.8.1983 г. Пахаваны ў в. Дворышча Расонскага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

…Вайсковае падраздзяленне праследавала групу маджахедаў. П. П. Ларкоў ішоў адным з першых. Каля населенага пункта Вардан пад Кабулам воіны трапілі ў засаду. У час перастрэлкі П. П. Ларкоў загінуў.